# ВОДЗЫЎ

апанента па дысертацыйнай працы
ВАСІЛІЯ ІГАРАВІЧА ЖУКА
«Альфакторны кантынуум беларускай і англійскай моў: на матэрыяле другасных намінацый», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства

**1. Адпаведнасць дысертацыі спецыяльнасці і галіне навукі, па якіх яна прадстаўлена да абароны**

Дысертацыя Васілія Ігаравіча Жука «Альфакторны кантынуум беларускай і англійскай моў: на матэрыяле другасных намінацый», паводле прадмета даследавання, методыкі выканання, зместу, атрыманых вынікаў адпавядае галіне навукі (філалагічныя навукі) і заяўленай спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства.

**2. Актуальнасць тэмы дысертацыі**

Даследаванне сутнасці аднаго з пяці агульнавядомых спосабаў пачуццёвага ўспрымання навакольнай рэчаіснасці дазваляе канстатаваць, што праблема паху ўяўляе сабой адно з найбольш дыскусійных пытанняў у розных прыродазнаўчых і гуманітарных галінах ведаў. Пах як пэўны раздражніцель абаняльных рэцэптараў жывых арганізмаў актыўна вывучаецца ў хіміі, фізіцы, біялогіі, медыцыне, псіхалогіі, сацыялогіі, культуралогіі, нейрафізіялогіі і многіх іншых навуках. Філалагічная навука ў цэлым і мовазнаўства ў прыватнасці не засталіся ў баку ад працэсаў даследавання феномену альфакторнасці, аднак да гэтага часу не выяўлены найбольш поўныя рэестры благавонных/ духмяных намінацый, не праведзена іх класіфікацыя, не ўстаноўлены прадуктыўныя спосабы ўтварэння пахавых лексічных адзінак і інш. Напэўна, прычына, якая ўскладняе адназначнае вызначэнне катэгорыі альфакторнасці і яе класіфікацыйных прынцыпаў, заключаецца ў надзвычайнай варыятыўнасці, зменлівасці, суб’ектыўнасці, невыразнасці і немагчымасці непасрэднага назірання пахавых увасабленняў. Менавіта таму даследаванне Васілія Ігаравіча Жука ў пэўнай ступені ліквідуе існуючы прабел і вызначае канкрэтныя шляхі вырашэння праблемы, каб наблізіцца да разумення сутнасці гэтай складанай па сваёй прыродзе і сіле ўздзеяння з’явы мыслення і мовы. Актуальнасць даследавання абумоўлена, між іншым, існуючай ў мове дыспрапорцыяй невялікай колькасці афіцыйнай лексікі для абазначэння розных пахаў і няспыннай неабходнасцю выяўлення новых намінацый, утвораных у выніку семантычнай дэрывацыі. Апрача таго, неабходна адзначыць і адсутнасць грунтоўных манаграфічных даследаванняў

альфакторных намінацый, прыцягненне да аналізу матэрыялаў іншых моў. Сучасныя працэсы міжмоўнай камунікацыі актуалізуюць даследаванні па выяўленні нацыянальна-культурнай адметнасці альфакторных кантынуумаў розных моў. Актуальнасць таксама абумоўлена выяўленнем рэальных і патэнцыяльных семантычных мадэлей і спосабаў утварэння другасных ЛСВ за кошт іх пашырэння ў сферы парфумернага дыскурсу і рэкламнага бізнесу.

**3. Ступень навізны вынікаў, атрыманых у дысертацыі, і навуковых палажэнняў, якія выносяцца на абарону**

Дысертацыйнае даследаванне В.І. Жука з’яўляецца арыгінальнай працай, у якой упершыню праведзена супастаўляльнае даследаванне альфакторных намінацый у беларускай і англійскай мовах, выяўлены тыпалагічныя і спецыфічныя рысы “пахавых” лексічных адзінак, устаноўлены тыпы семантычнай суаднесенасці паміж беларускімі і англійскімі намінацыямі (з адносінамі міжмоўнай эквіналетнасці, частковага супадзення і безэквівалентнасці). Матэрыялы, якія прадстаўлены ў дысертацыі, да гэтага часу не падвяргаліся сістэмнаму, комплекснаму даследаванню.

У дысертацыі пашырана сфера выкарыстання семантычных мадэлей, па якіх у выніку семантычнай дэрывацыі ўтвараюцца другасныя ЛСВ. Альфакторны кантынуум другасных субстантыўных намінацый у беларускай і англійскай мовах вызначаецца пэўнай паралельнасцю фарміравання тэматычных груп. Меліяратыўныя і пеяратыўныя канатацыі выяўляюцца ў ЛСВ ад’ектываў, якія апелююць да эмацыянальна-ацэначнай сферы ўжывання.

Новым у даследаванні з’яўляецца вызначэнне спецыфікі вербалізацыі катэгорыі альфакторнасці ў розных лексіка-граматычных разрадах слоў (назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў). Упершыню ў якасці фактычнага матэрыялу выкарыстоўваюцца аказіянальныя другасныя альфакторныя лексіка-семантычныя варыянты, выяўленыя ў творах мастацкай і публіцыстычнай літаратуры.

Упершыню праведзена мадэляванне альфакторнага кантынуума з улікам донарскай і рэцыпіентнай сфер, што дазволіла выявіць прамыя і адваротныя, узуальныя і аказіянальныя семантычныя мадэлі. На аснове выяўленага рэпрэзентатыўнага матэрыялу ўпершыню створаны «Беларуска-англійскі тлумачальны слоўнік альфакторных намінацый». Ступень навізны навуковых палажэнняў і вынікаў дысертацыі, якія выносяцца на абарону, высокая.

**4. Абгрунтаванасць і дакладнасць заключных вывадаў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі**

Вывады і рэкамендацыі, сфармуляваныя ў дысертацыі, з'яўляюцца абгрунтаванымі і верагоднымі, пацвярджаюцца багатым і разнастайным фактычным матэрыялам. Аўтар прадэманстраваў дасканалае веданне тэарэтычнай літаратуры па тэме: у спісе выкарыстанай літаратуры прыводзіцца 226 назваў кніг, навукова-метадычных артыкулаў і іншых публікацый. У даследаванні выкарыстоўваюцца наглядныя сродкі візуалізацыі, да ліку якіх адносяцца табліцы і рысункі. Абгрунтаванасць і дакладнасць заключных вывадаў і рэкамендацый пацвярджаецца шырокай апрабацыяй вынікаў даследавання: асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 12 публікацыях.

Важным укладам у сучасную лексікаграфію з'яўляюцца тры дадаткі да дысертацыі, у якіх змешчаны матэрыялы, прадстаўленыя першаснымі і другаснымі ЛСВ субстантываў, ад'ектываў і дзеясловаў. Поўны і ўсебаковы аналіз фактычнага матэрыялу, а таксама выкарыстанне сучаснай метадалогіі робяць навуковыя палажэнні і вывады дысертацыі абгрунтаванымі, пераканальнымі і пацвярджаюць іх дастаэернасць.

**5. Навуковая, практычная і эканамічная значнасць вынікаў і асноўных навуковых палажэнняў дысертацыі**

Навуковая значнасць даследавання заключаецца ў тым, што яго вынікі ўносяць значны ўклад у тэорыю і практыку семантычнай дэрывацыі, семасіялогію, метафаралогію і будуць спрыяць актывізацыі даследчыцкай дзейнасці па распрацоўцы тыпалогіі катэгорыі словаўтваральнай другаснасці, правядзенні агульнай класіфікацыі другасных ЛСВ усіх лексіка-граматычных класаў слоў, вызначэнні асноўных прынцыпаў і механізмаў узаемадзеяння разумовых і моўных сфер, рацыянальных і перцэпцыйных кампанентаў у працэсе намінацыі. Навуковая значнасць дысертацыі В.І. Жука выражаецца ў комплексным супастаўляльным даследаванні другасных альфакторных намінацый беларускай і англійскай моў, выяўленні тыпалагічных і дыферэнцыяльных (гістарычных, нацыянальна-культурных) асаблівасцей такіх намінацый. Распрацаваная аўтарам методыка мадэлявання сэнсавых структур альфакторных субстантываў, ад'ектываў і дзеясловаў уносіць значны ўклад у тэорыю семантычнага мадэлявання і можа выкарыстоўвацца для выяўлення тыпалагічных і ўніверсальных мадэлей, а таксама рэгулярных пераасэнсаванняў у іншых тэматычных групах лексікі.

Матэрыялы дысертацыі знойдуць выкарыстанне ў навучальным працэсе: пры выкладанні курсаў па лексікалогіі, семасіялогіі, лексікаграфіі, параўнальнай тыпалогіі беларускай і англійскай моў, напісанні дыпломных і магістарскіх работ. Выкарыстанне матэрыялаў забяспечыць больш высокі тэарэтычны і практычны ўзроўні падрыхтоўкі філолагаў да эфектыўнай

педагагічнай дзейнасці, вырашэння актуальных праблем сучаснай лінгвістычнай навукі і адукацыі.

Матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны ў лексікаграфічнай і перакладчыцкай практыцы. Улік шэрагу важных фактычных даных дысертацыі можа прывесці да ўдасканалення распрацоўкі слоўнікавых артыкулаў, сістэматызацыі дэфініцый у тлумачальных і двухмоўных слоўніках, стварэнні тэматычных, ідэаграфічных і перакладных слоўнікаў.

Сацыяльная і эканамічная значнасць дысертацыйнай працы заключаецца ў тым, што ў ёй змяшчаецца шэраг важных фактычных даных, улік якіх зможа прывесці да ўдасканалення навучальных праграм і вучэбна-метадычнага забеспячэння вывучэння абедзвюх моў, зместу практычных распрацовак у галіне беларускай і англійскай моў.

Практычныя матэрыялы даследавання могуць выкарыстоўвацца пры выбары лагічна абгрунтаванай назвы для тых ці іншых вырабаў, стварэнні парфумерна-касметычнага тэзаўруса. Альфакторная метафара можа разглядацца як адзін з ключавых кампанентаў пры апісанні рэкламнага парфумернага дыскурсу.

**6. Апублікаванасць вынікаў дысертацыі ў навуковым друку**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання А. І. Жука знайшлі адлюстраванне ў 12 работах саіскальніка, сярод якіх 5 публікацый (2,3 аўт. арк.) у часопісах, уключаных у пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйнага даследавання, 7 артыкулаў у зборніках навуковых прац (2,2 аўт. арк.). Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 4,5 аўт. арк.

**7. Афармленне дысертацыі,** аўтарэферата, а таксама спіса выкарыстанай літаратуры адпавядаюць патрабаванням Інструкцыі па афармленні дысертацый і аўтарэфератаў. Аўтарэферат адпавядае зместу дысертацыі, вынікам і асноўным палажэнням, якія выносяцца на абарону.

**8. Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка навуковай ступені, на якую ён прэтэндуе.** Дысертацыйная праца напісана добрай літаратурнай мовай, структурна лагічна арганізаваная, стылістычна і арфаграфічна выверaная. Навуковая кваліфікацыя Васілія Ігаравіча Жука адпавядае вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

Крытычныя заўвагі і дыскусійныя прапановы дысертанту могуць быць зведзены да наступнага.

**9. Недахопы дысертацыі**

1. У тэксце дысертацыі неаднаразова сустракаюцца тэрміны «альфакторны» і «адарычны». Часам, яны ўжываюцца ў адным сказе: “У

беларускай мове большасць субстантыўных элементаў альфакторнага кантынуума мае толькі адзін кадыфікаваны адарычны ЛСВ” [с. 85]. У чым заключаецца адрозненне паміж альфакторнымі і адарычнымі намінацыямі?

2. Пры класіфікацыі ад’ектываў выкарыстоўваюцца разнастайныя крытэрыі, якія часам перакрыжоўваюцца, накладваюцца адзін на другі. У адных выпадках класіфікацыя адбываецца па наяўнасці або адсутнасці канатацыі, у другіх выпадках улічваецца крыніца паху, у трэціх – характар уздзеяння на чалавека, у чацвёртых – суаднесенасць з неальфакторнымі прыметнікавымі адзінкамі і інш. Такі шырокі класіфікацыйны рад змяшчае ў адным рысунку (рысунак 2.2) лінгвістычныя, псіхафізіялагічныя, экстралінгвістычныя крытэрыі (ці паказчыкі). Мы разумеем, што ўсеагульную класіфікацыю правесці складана, і ў той жа час пытанне: Ці магчыма знайсці адзіны інварыянтны крытэрый, згодна з якім можна правесці агульную класіфікацыю ўсіх вядомых пахаў і водараў?

3. Бясспрэчным з’яўляецца факт пастаяннага развіцця лексічнага складу мовы. Гэта мае непасрэднае дачыненне і да альфакторнага кантынуума. У сувязі з гэтым пытанні: Пашырыцца ці звузіцца сфера альфакторных намінацый? Якія структурныя змены будуць назірацца (ці ўжо назіраюцца) пры выкарыстанні такіх намінацый? Моўныя ці пазамоўныя фактары стануць вызначальнымі пры назвах новых парфумерных вырабаў?

4. Як вядома, у многіх альфакторных намінацыях змяшчаецца канататыўны кампанент, які накладваецца на логіка-інфармацыйную частку лексічнага значэння. Наяўнасць станоўчых ці адмоўных элементаў канатацыі абумоўлена не толькі нацыянальнымі традыцыямі, культурнымі ўяўленнямі тых ці іншых народаў, але і суб’ектыўнасцю ўспрымання і ацэньвання пахаў. Адзін і той жа пахавы стымул можа па-рознаму ацэньвацца прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей, людзьмі розных узроставых і сацыяльных катэгорый. У чым спецыфіка ці якія канатацыі пераважаюць у альфакторным кантынууме беларускай і англійскай моў?

Выказаныя заўвагі і пытанні не зніжаюць каштоўнасці праведзенага дысертацыйнага даследавання.

**10. Заключэнне**

Дысертацыйнае даследаванне В. І. Жука «Альфакторны кантынуум беларускай і англійскай моў: на матэрыяле другасных намінацый» з’яўляецца кваліфікацыйнай навуковай працай, выкананай пад кіраўніцтвам доктара філалагічных навук, прафесара В. Д. Старычонка. Змест дысертацыі адпавядае спецыяльнасці 10.02.20 – параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства. На гэтай падставе ў адпаведнасці з пунктамі 19, 20 Палажэння аб прысуджэнні ступеней і прысваенні вучоных званняў у

Рэспублiцы Беларусь аўтар дысертацыi В. I. Жук заслугоўвае прысуджэння вучонай ступенi кандыдата фiлалагiчных навук за:

– ажыццяўленне першага цэласнага, комплекснага даследавання альфакторных намiнацый у беларускай i англiйскай мовах;

– выяўленне, сiстэматызацыю i прадстаўленне найбольш поўнага рэестра альфакторных беларускiх i англiйскiх лексiчных адзiнак (звыш 640 лексем беларускай i англiйскай моў) у выглядзе семантычна ўпарадкаванага спiсу слоў – першага ў лексiкаграфii «Беларуска-англiйскага тлумачальнага слоўнiка альфакторных намiнацый»;

– устанаўленне корпуса аказiянальных i iндывiдуальна-аўтарскiх неальфакторных найменняў у трох лексiка-граматычных класах слоў (ад’ектывах, субстантывах, дзеясловах) i ступенi iх уключанасцi ў альфакторны кантынуум беларускай i англiйскай моў;

– вылучэнне альфакторнай ад’ектыўнай базы/ прасторы беларускiх i англiйскiх прыметнiкаў (240 i 300 адзiнак адпаведна), выяўленне сiнестэтычных пераходаў з донарскай зоны “смак” па метафарычных мадэлях “час – пах”, “тактыльнасць – пах”, “колер – пах” i iншыя, вызначэнне 16 тэматычных блокаў, звязаных з альфакторнасцю (якасная характарыстыка, крынiца паху, уздзеянне на чалавека, iнтэнсiўнасць/ экстэнсiўнасць, густаторнасць i г. д.);

– вызначэнне спецыфiкi семантычнай дэрывацыi ў субстантыўных i дзеяслоўных альфакторных намiнацыях i ўстанаўленне прамых $N \rightarrow A$, $A_1 \rightarrow A_2$ i прыкладаў абарачальных/ адваротных разнавiднасцей $A \rightarrow N$ семантычных мадэлей, (дзе N – неальфакторны ЛСВ, A – альфакторны ЛСВ);

– устанаўленне тыпалагiчнай тоеснасцi ўнiверсальных семантычных мадэлей альфакторных успрыняццяў носьбiтамi моў i мiжмоўных адрозненняў, абумоўленых асаблiвасцямi менталiтэту народаў i спецыфiкай моўных сiстэм беларускай i англiйскай моў.

22 сакавiка 2023 г.

Доктар фiлалагiчных навук, загадчык
аддзела сучаснай беларускай мовы
Iнстытута мовазнаўства iмя Якуба Коласа
ДНУ«Цэнтр даследаванняў беларускай культуры,
мовы i лiтаратуры НАН Беларусi» В. П. Русак

Подпiс ПАЦВЯРДЖАЮ
Старшы iнспектар
па кадрах Т. В. Вяйкава

22.03.2023